можна спазьніцца із замерамі. Ня цяжка праводзіць якое заданьне, маючы на яго сяродкі, але цяжка пачынаць безь сяродкаў. Як гэта ні дзіўна, найчасьцей вялікія замеры былі здойсьнены тады, як іх пачыналі безь сяродкаў, і тады ўжо, праводзячы свае імкненьні, заданьні, мэту, гатавалі на іх і сяродкі.

Чым жа ўсьцім мы свайго Дарагога Нябожчыка?

Найлепей усьцім, робячы тое, што ён рабіў працаю дзеля народу свайго.

Неадвалочным заданьням нашым ё ратаваць наша маладое пакаленьне ад асыміляцы, ад адарваньня яго ад народу свайго. Найпершаю справаю ў гэтым заданьню ё навучыць усіх Вялікаліцьвіноў–эміґрантаў, малых, маладых і сталых, чытаць і пісаць павялікалітоўску, бо бязь гэтага ня можна мець да іх прыступу, ані яны ня будуць мець прыступу да спраў народу свайго. Рабіць жа гэта надабе сыстэматычна й арганізавана. Адныя верацъ у дасьпех такое работы, другія ня верацъ, але няхай і яны ўлучаюцца да гэтае працы, няхай працуюць з абавязку. Ці людзі, ці мы робім толькі тады, як пэўныя ў дасьпех? Ці ня болей тады, як такое пэўнасьці ня маеш? Працуючыя толькі з абавязку неўзабаве пераканаюцца, што справа не безнадзейная, адлі, што яна пэўная. Наапошку справа абыйме ўсіх, і рэзультаты яе могуць перайсьці нашы найбольшыя спадзяваньні.

# Выдатныя вялікаліцьвіны (Беларусы)

*Аляксандра Твардоўскі*, адзін із найвялікшых поэтаў СССР, быты рэдактар літаратурнага часапісу „Новы мір“, ходаньнік за дэмократызацу жыцьця ў СССР. Паходзіў із Смаленшчыны. Прымаў удзел ад Смаленшчыны ў камуністычным зьезьдзе ў Смаленску 1919 г., які прагаласіў Беларускую Радзкую Рэспубліку із сталіцаю ў Смаленску. Ня толькі цяперашняя абцятая Радзкая Рэспубліка Беларуская, але таксама Севершчына, Смаленшчына й Пскоўшчына ўходзілі ў граніцы прагалошанай тады Беларускай Радзкай Рэспублікі. Як сам Твардоўскі пісаў у сваіх успамінах, паходзіў ён із мясцовасьці, ідзе гукалі, як і ён сам, вялікалітоўскаю (беларускаю) моваю, самы таго ня ведаючы. Лучыўшы нацанальным нясьведамым у рас. атачэньне, ён стаў расійскім паэтам, але ніколі не парываў зьвязку зь Вялікалітвою і яе літаратураю. Памёр 1971 г. Прозьвішча ягонае „Твардоўскі“ замест „Цьвярдоўскі“ зьясьняецца наступным парадкам. За незалежнага задзіночанага гаспадарства свайго, зв. Вялікім Князствам Літоўскім, Вялікаліцьвіны (Беларусы) пісалі Твердовскі (бо быў правапіс этымолёґічны і мяккое *ц* запісавалі літараю *т*). А як з часам рэдчас перапісавалі лацініцаю, то перапісавалі літару за літараю гэтак: *Tverdovski*, каторае кажны Вялікаліцьвін–Беларус можа вымавіць толькі як „Твардоўскі“ і гэтак запіша подле правапісу новае літаратурнае мовы.

*Сяргей Канянок (Канянкоў)*, найвыдатнейшы скульптар СССР, Вялікаліцьвін із Смаленшчыны. Памёр летась маючы 98 год.

# Ці езьдзіў дохтар Пранціш Скарына да Масквы?

У даўгім артыкуле „Доктар Скарына ў Маскве“ (Запісы, кн. 2, б. 9—36, у Мюнхэне, 1963) Сымон Брага сілуецца давесьці, што дохтар Пранціш Скарына езьдзіў да Масквы, каб прадаваць там свае кнігі і нат закласьці друкарства.

Будучы сынам купцовым, Скарына, адылі, купцом ня быў: няма ніякіх пазнак, каб хоць троху ён прабаваў таргаваць. Як довад такое спробы Брага прыводзе перасланьне